*Т. У. Пецюкевіч*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*T. Petsiukevich*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 332.8.02(476-25)(091)“1921/1928”**

# ЖЫЛЛЁВАЯ ПАЛІТЫКА Ў БССР У ПЕРЫЯД НЭПА (1921–1928 ГГ.): НА ПРЫКЛАДЗЕ Г. МІНСКА

# HOUSING POLICY IN THE BSSR DURING THE NEP PERIOD (1921–1928): ON THE EXAMPLE OF MINSK

*Артыкул прысвечаны праблеме жыллёвай палітыкі, якая вызначаецца як комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на забеспячэнне насельніцтва жыллём. У БССР у перыяд НЭПа праблема вострага жыллёвага крызіса вырашалася шляхам муніцыпалізацыі існуючага жыллёвага фонда з наступным пераразмеркаваннем жылплошчы, дзейнасці жыллёвай кааперацыі, вядзеннем новага будаўніцтва. Класавы прынцып, уласцівы жыллёвай палітыцы, асабліва ярка выражаўся ў фарміраванні квартплаты.*

*Палітыка «новага быта», накіраваная на рэфармаванне паўсядзённага жыцця, у жыллёвай сферы адлюстроўвалася як рух за стварэнне камун з абагульненнем маёмасці і вядзеннем калектыўнай гаспадаркі.*

*Ключавыя словы: жыллё; жыллёвая палітыка; муніцыпалізацыя; класавы прынцып; жыллёвы крызіс; камуны.*

*The article is devoted to the problem of housing policy, which is defined as a set of measures aimed at providing housing to the population. In the BSSR during the NEP period, the problem of acute housing crisis was solved by the municipalization of the existing housing stock, followed by the redistribution of living space, the activities of housing cooperatives, and the conduct of new building. The class principle inherent in housing policy was especially pronounced in the formation of rent.*

*The policy of the «new way of life» aimed at reforming everyday life in the housing sector was reflected as a movement for the creation of communes with the socialization of property and the allocation of collective household.*

*Keywords: housing; housing policy; municipalization; class principle; housing crisis; communes.*

Жыллёвая палітыка з’яўляецца структурнай часткай сацыяльна-эканамічных мерапрыемстваў дзяржавы і накіравана на забеспячэнне жыллём тых, хто мае патрэбу. Перыяд НЭПа стаў часам станаўлення і фарміравання асноўных кірункаў савецкай жыллёвай палітыкі.

Значны ўнёсак у даследаванне жыллёвай палітыкі ў БССР перыяду НЭПа зрабіў беларускі даследчык В. М. Буракоў. Дадзенай праблеме прысвечаны шэраг артыкулаў: «Муніцыпалізацыя жыллёвага фонду ў БССР (1919–1929)» [1], «Класавы прынцып жыллёвай палітыкі БССР у перыяд

НЭПа» [2], «Абмежаванне права карыстання жылой плошчай у Беларускай ССР у 1920-я гг.: гісторыка-прававы аспект» [3].

Перыяд НЭПа вызначаецца даследчыкам як час станаўлення дзяржаўнай жыллёвай палітыкі, якая была накіравана на ліквідацыю жыллёвага крызісу. Асноўнымі мерапрыемствамі ў галіне жыллёвага пытання сталі муніцыпалізацыя і размеркаванне жылплошчы ў адпаведнасці з усталяванай нормай. Характэрнай рысай савецкай жыллёвай палітыкі з'яўляўся класавы прынцып. Прадастаўленне прыватным асобам права забудовы, дзейнасць жыллёвай кааперацыі сведчылі пра няздольнасць дзяржавы ўласнымі сіламі вырашыць праблему недахопу жылля.

Праблема савецкай жыллёвай палітыкі 1920–1930-х гг. даследавалася М. Г. Меяровічам. У сваёй працы «Пакаранне жыллём: жыллёвая палітыка ў СССР як сродак кіравання людзьмі (1917–-1937 гг.)» [4] аўтар прапаноўвае тэорыю аб тым, што ўлада не была зацікаўлена ў вырашэнні праблемы жыллёвага крызісу і выкарыстоўвала жылплошчу як інструмент уздзеяння на «непрацоўных» і «кепска працуючых».

Найбольш яскрава станаўленне і фарміраванне жыллёвай палітыкі разглядаемага перыяду прасочваецца на прыкладзе г. Мінска, што было абумоўлена памерамі і статусам горада, больш імклівым прыростам насельніцтва адносна іншых акружных гарадоў. Адыгрывала сваю ролю і тое, што Мінск знаходзіўся блізка да мяжы: у горадзе неабходна было размяшчаць гарнізон.

Глабальнай мэтай савецкай улады была пабудова камуністычнага грамадства. Для дасягнення дадзенай мэты недастаткова было пераўтварэнняў толькі ў палітычнай сферы – перабудове падлягалі ўсе бакі дзейнасці людзей, у тым ліку прыватнае жыццё. Адным з яго вымярэнняў была жыллёвая прастора.

Ідэі сацыялізацыі паўсядзённасці атрымалі назву «новага быта», які грунтаваўся на класавым прынцыпе размеркавання матэрыяльных і культурных каштоўнасцей, калектывізму, ідэях эмансіпацыі жанчыны, рэвалюцыйнай эстэтыцы, аскетызму. Прагрэсіўным відам жылля аб'яўляліся дамы-камуны з абагульненнем рэчаў, калектыўным выхаваннем дзяцей і вядзеннем агульнай гаспадаркі [5, с. 80].

Першым крокам савецкай улады ў сферы жылля стала рэалізацыя класавага падыходу, які ўяўляў сабой дыферэнцыяцыю насельніцтва па сацыяльнаму паходжанню і роду заняткаў: дзяржава падтрымлівала рабочых, служачых, чырвонаармейцаў, астатнія сацыяльныя групы разглядаліся як крыніца папаўнення бюджэту [2, с. 11]. Меркавалася, што жылплошчы ў горадзе дастаткова і трэба яе толькі правільна размеркаваць, для чаго неабходна было стварыць дзяржаўны жыллёвы фонд. Пастанова НКУС ад 30 кастрычніка 1917 г. «Аб правах гарадскіх самакіраванняў у справе рэгулявання жыллёвага пытання» надзяліла мясцовыя ўлады правам засяляць у пустуючыя

памяшканні тых, каму патрабуецца жыллё. Дэкрэт СНК «Аб забароне здзелак з нерухомасцю» ад 14 снежня 1917 г. прыпыніў з 18 снежня ўсе аперацыі з нерухомасцю [4, с. 14]. У выніку гэтых пастаноў жыллё поўнасцю аказалася ў сферы кампетэнцыі дзяржаўных органаў. 2 сакавіка 1918 г. публікуецца «Праект дэкрэта аб усяленні сем'яў чырвонаармейцаў і беспрацоўных рабочых у кватэры буржуазіі і нарміроўцы жылых памяшканняў», які санкцыянаваў муніцыпалізацыю крупных домаўладанняў, высяленне буржуазіі і засяленне туды працоўных. Дэкрэт УЦВК РСФСР «Аб адмене права прыватнай уласнасці на нерухомасць у гарадах» ад 20 жніўня 1918 г. адмяніў права прыватнай уласнасці на зямлю, якая знаходзілася пад жылымі дамамі. У гарадах з колькасцю насельніцтва больш за 10 тыс. чалавек адмянялася права прыватнай уласнасці на дамы, цана якіх перавышала кошт, усталяваны мясцовымі ўладамі ў якасці памежнага. Пасля муніцыпалізацыі такія домаўладанні станавіліся камунальнымі [1, с. 106].

У 1919 г. усталёўваецца норма жылплошчы на чалавека, якой трэба было кіравацца пры засяленні, – 1,8 кв. саж. (8 кв. м) [4, с. 18]. Рэзалюцыя VIII з'езда РКП(б) у сакавіку 1918 г. канстатавала, што шляхам экспрапрыяцыі домаўладанняў, перадачы іх гарадскім Саветам і масавага перасялення рабочых з ускраін у буржуазныя дамы, савецкая ўлада імкнецца палепшыць жыллёвыя ўмовы працоўных, ліквідаваць кучнасць і антысанітарыю і дасягнуць рацыянальнага рассялення [6, с. 90].

У вялікіх муніцыпалізаваных дамах узнікалі «бытавыя» ці «жыллёвыя» камуны, што было абумоўлена адсутнасцю фінансавых сродкаў на будаўніцтва спецыялізаваных дамоў-камун. Напрыклад, былы даходны дом Кастравецкай па вул. Савецкай, 20 быў ператвораны ў Дом металістаў і заселены сем'ямі рабочых завода «Энергія» і металаапрацоўчых майстэрняў па 4–7 сем'яў у кватэру. Былі выдзелены памяшканні для «грамадскіх патрэбаў» – бібліятэкі-чытальні, пакоі адпачынку, пральні і г. д. Ажыццяўляліся спробы агульнага выхавання дзяцей, у шэрагу выпадкаў вялася агульнай гаспадарка [7, с. 16].

Для жыллёвых камун партыйна-савецкай эліты былі адведзены будынкі ў цэнтры Мінска. Былы Дом Абрампольскага па вул. Савецкай, 31 стаў першым Домам Саветаў, будынак па вул. К. Маркса, 30 атрымаў назву Другога Дома Саветаў [5, с. 83].

На шляху да фарміравання новага быта значныя надзеі ўкладаліся на моладзь. Заклік да стварэння моладзевых камун прагучаў на XII канферэнцыі КП(б)Б у сакавіку 1923 г. Да 1929 г. моладзевыя камуны былі створаны ў мінскім палітэхнікуме, музтэхнікуме, гідратэхнікуме [5, с. 86].

Ідэя стварэння дамоў-камун, як і цэлым палітыка «новага быта», не адыгралі значнай ролі ў жыллёвай палітыцы і не знайшлі шырокай падтрымкі насельніцтва.

На 1925 г. жыллёвы фонд Мінска складаўся з 6050 домаўладанняў жыллёвай плошчай 179 тыс. кв. саж. [8, л. 33]. З іх камунальнымі былі 1260 агульнай жылплошчай у 84 тыс. кв. саж. Прыватнаўласніцкіх налічвалася 4790, агульная жылплошча якіх склала 95000 кв. саж. [9, с. 4]. Такім чынам, на камунальныя дамы прыпадала 47 % ад агульнай жылплошчы, а на прыватнаўласніцкія – 53 %.

Значная частка камунальных дамоў знаходзілася ў незадавальняючым стане: 30 % патрабавалі перакрыцця даху, 50 % – частковай замены балак, 20 % мелкага рамонту. Фінансавых сродкаў для рамонту не хапала. Выйсцем з сітуацыі стала жыллёвая кааперацыя, якая пачала сваю дзейнасць з 1924 г. Камунальныя дамы передаваліся жылёва-арэндным таварыствам (ЖАКТам) на ўмовах абавязковага правядзення рамонту.

На 1925 г. у 40 жылтаварыстваў у арэндзе знаходзіліся 294 домаўладання, прафсаюзамі арандаваліся 37 дамоў, прыватнымі асобамі – 203 дома, 235 домаўладанняў былі заняты ўстановамі. Каля 30 % жылплошчы камунальных дамоў была адведзена пад тэатры і клубы [9, с. 4]. За выключэннем ужо арэндаваных дамоў, і дамоў, якія планаваліся да здачы ў арэнду, дэмуніцыпалізацыі, продажу, заставаліся 100 домаўладанняў, якія патрабавалася перавесці на гаспадарчы разлік.

Кіраўніцтва дзяржаўным жыллёвым фондам знаходзілася ў сферы кампетэнцый адзела камунальнай гаспадаркі, які падпарадкоўваўся Мінгарвыканкаму. Пасля стварэння ў 1924 г. гарадскіх саветаў акруговых гарадоў кіраванне жыллём перайшло да камунальнага адзела выканкама Мінскага акруговага савета.

У камунальных дамах ствараліся дамавыя камітэты, якія абіраліся тэрмінам на 6 месяцаў і зацвярджаліся адзелам кіравання гарадскога выканкама. Сярод абавязкаў дамавых камітэтам было вядзенне ўліку жыхароў домаўладання, размеркаванне і ўлік кватэр, кантроль над санітарным станам памяшканняў і прылягаючай тэрыторыі, сваечасовым вывазам смецця і г. д. [10, л. 49].

На сходзе жыхароў абіраўся кіруючы домам, кандыдатура якога зацвярджалася пасля жыллёвым аддзелам. У абавязкі кіруючага домам уваходзіла назіранне за станам домаўладання, правядзенне бягучага рамонту, улік жыхароў, вядзенне грашовай і матэрыяльнай справаздачнасці домакіравання.

Плата за жыллё фарміравалася з улікам класавага прынцыпу і залежала ад роду заняткаў і сумы заробку. Напрыклад, пастанова СНК БССР аб аплаце жылых памяшканняў у гарадскіх паселішчах БССР ад 1 ліпеня 1925 г. за 1 кв. саж. для рабочых з заробкам у 20 руб. усталёўвала квартплату ў памеры 15 кап., ад 20 да 30 руб. – 20 кап., ад 31 да 40 руб. – 30 кап. і г. д. Для асобаў свабодных прафесій квартплата налічвалася ў памеры не больш за 5 руб., для ўладальнікаў гандлёвых патэнтаў I і II разрадаў –

1 руб. 50 кап., для саматужнікаў і рамеснікаў – не больш за 2 р. 50 кап. Памер квартплаты для маючых непрацоўны даход і выкарыстоўваючых наёмную працу ўсталёўваўся па згодзе з домаўладальнікаў. Гарышча, паўпадвальныя і цёмныя памяшканні аплачваліся ў памеры 50 % усталяванага тарыфу [11, с. 15].

Згодна са статыстычным даследаваннем жыллёвых умоў рабочых і служачых 17-ці прафсаюзаў, праведзеным у 1925 г., сярэдні памер квартплаты за 1 кв. саж. у Мінску склаў 0,63 руб. Ад агульнага даходу сям'і плата за жыллё склалала 6,4 %. Самая танная квартплата была ў Віцебску – 0,54 руб. за кв. саж., а самая высокая  у Мазыры, дзе яна склала 0,87 руб. [12, с. 71]. Пры гэтым менавіта Мазыр вылучаўся сваім антысанітарным станам: пад катэгорыю «бруднага» тут падпадала 36 % жылля [12, с. 68].

Што тычыцца прыбытковасці домаўладання, то, нягледзячы на дыферэнцыяванасць квартплаты згодна з класавым прынцыпам, яна залежала ад месцазнаходжання дома. Так, прыбытак з 1 кв. саж. у цэнтры горада ў залежнасці ад велічыні домаўладання, складаў ад 99 кап. да 8 руб. 85 кап. Прыбытковасць жылплошчы на ўскраінах была значна менш: ад 7 да 78 кап. Такая сітуацыя была абумоўлена тым, што ў цэнтры жылі пераважна асобы з «непрацоўным» даходам, а таксама рабочыя і служачыя з заробкам вышэй за сярэдні. Адпаведна, кватэрная такса для іх была вышэйшая, што павялічвала прыбытак ад домаўладання. Па-другое, у цэнтры горада знаходзілася шмат гандлёвых памяшканняў, плата за якія вар'іравалася ад 5 да 13 руб. [13, с. 178].

Адным са шляхоў павелічэння жылплошчы было будаўніцтва. У 1925 г. планавалася пабудаваць 2880 кв. саж. жылплошчы. Улічваючы штогадовы прырост насельніцтва, які ацэньваўся ў 6500 чалавек, было распачата будаўніцтва прыкладна ў 0,5 кв. саж. на чалавека, чаго было недастаткова. У 1926 г. памер новапабудаванай жылплошчы планавалася павялічыць да 4700 кв. саж. [8, л. 36].

У сваім дакладзе аб дзейнасці Мінгарсавета старшыня С. В. Яцкевіч на паседжанні ў лютым 1927 г. адзначаў, што з мая 1926 па студзень 1927 г. жыллёвае будаўніцтва склала 6500 кв. саж., амаль дасягнуўшы даваеннага ўзроўня. Пераважалі прыватныя будаўнікі  52 %, дзяржава пабудавала 40 %, кааперацыя – 8 % [14, с. 148]. Такія працэнтныя суадносіны не адпавядалі планам савецкай улады па стварэнні моцнага дзяржаўнага жыллёвага фонду, дазвол на прыватнае і кааператыўнае будаўніцтва быў звязаны з неабходнасцю вырашыць праблему вострага недахопу жылля. Прыватнае будаўніцтва было пераважна драўляным і малапавярховым, што давала магчымасць у кароткі тэрмін атрымаць танную жылплошчу. Такая сітуацыя разглядалася як часовая: праз 15–20 гадоў планавалася замяніць гэтыя дамы капітальнай забудовай.

Дзеля пераразмеркавання жылплошчы праводзіліся высяленні і ўшчыльненні. Пастановай ЦВК БССР ад 7 верасня 1922 г. было дазволена высяленне з камунальных дамоў у выпадку драпежніцкіх адносінаў да памяшкання, адсутнасці платы за кватэру на працягу трох месяцаў. Прафсаюзы і ўстановы надзяляліся правам высяляць тых, хто не меў да іх ніякага дачынення. Аналагічныя пастановы прымаліся і ў наступныя гады. 15 верасня 1927 г. прымаецца пастанова ЦВК і СНК БССР ад «Аб прымусовым пацясненні ў дамах», якая ставіла сваёй мэтай канфіскацыю лішкаў жылплошчы [3, с. 34].

Нягледзячы на мерапрыемствы ўладаў у сферы жылля, у разглядаемы перыяд асноўнай праблемай заставаўся жыллёвы крызіс. Натуральны знос домаўладанняў, марудны рост новага будаўніцтва адносна росту колькасці насельніцтва прыводзілі да скарачэння сярэдняга памеру жылплошчы на чалавека: у 1923 г. на чалавека прыходзілася 1, 34 кв. саж., у 1924 г. – 1, 30 кв. саж., у 1925 г. лічба склала 1,2 кв. саж. пры норме ў 1,8 кв. саж. [8, л. 34].

Жыллёвую сітуацыю ўскладняла неабходнасць размяшчэння ў Мінску гарнізона па прычыне блізкасці горада да мяжы. Акрамя казармаў, гарнізону была адведзена плошча камунальных дамоў у памеры 3840 кв. саж у камунальных. Але нават пры гэтым на чырвонаармейца прыпадала 0,33 кв. саж. пры норме ў 1,4 кв. саж, а на аднаго чалавека камандуючага складу – 1,33 кв. саж пры норме ў 2,40 кв. саж. Пры існуючым колькасным складзе гарнізона мінімальная дадатковая плошча ацэньвалася ў 4475 кв. саж. [8, л. 34].

Вынікам недахопу жылплошчы стала з'яўленне камунальных кватэр – месцаў супольнага пражывання людзей, якіх не аб'ядноўвалі ні сямейныя, ні працоўныя або ўзроставыя сувязі. «Звязда» ў снежні 1925 г. у артыкуле «На барацьбу з разбурэннем жылой плошчы» пісала пра бытавыя праблемы такіх кватэр: «…у кватэры жывуць некалькі чалавек, але кожны з іх глядзіць толькі за сваім пакоем. У выніку кухні не ацапляюцца, замярзае і псуецца вадаправод. У жылтаварыства няма паўнамоцтваў паўплываць на жыхароў у гэтай сітуацыі» [15, с. 3]. Калідор і кухня, знаходзячыся ў агульным карыстанні, успрымаліся як "нічыйная" прастора. Камунальныя кватэры былі наступствам жыллёвага крызісу і не разглядаліся ўладамі ў якасці часткі палітыкі «новага быта».

Жыллёвая палітыка ў перыяд НЭПа фарміравалася ў кантэксце вырашэння пытання жыллёвага крызіса. Дзеля пераразмеркавання жыллёвага фонда дзяржава правяла яго муніцыпалізацыю, пры гэтым надзяленне жыллём і спагнанне квартплаты насіла класавы характар, які выражаўся ў падтрымцы працоўнага насельніцтва. Кіраўніцтва жыллёвым фондам ажыццяўляў камунальны аддзел мясцовага выканкама.

На шляху да пабудовы камуністычнага грамадства савецкія ідэолагі прапаноўвалі рэфармаваць сферу паўсядзённага жыцця людзей. Палітыка «новага быта» закранала ў тым ліку і жыллё: прапаноўвалася ствараць жыллёвыя камуны з абагульненнем рэчаў, выхаваннем дзяцей, вядзеннем агульнай гаспадаркі. Рух за стварэнне камун не сустрэў падтрымкі насельніцтва, для якога такія ідэі гучалі радыкальна. Кропка была пастаўлена рэзалюцыяй пленума ЦК ВКП(б) «Аб Маскоўскай гарадской гаспадарцы і аб развіцці гарадской гаспадаркі СССР» ад 15 чэрвеня 1931 г., які канстатаваў, што неабходна "рашучая барацьба" супраць выступаючых са ўсялякага рода пражэктарскімі прапановамі (прымусовая ліквідацыя індывідуальных кухняў, штучнае насаджэнне бытавых камун і г. д.) [16, с. 326].

Для захавання існуючага жыллёвага фонда і будаўніцтва новага ў 1924 г. была дазволена жыллёвая кааперацыя. Камунальныя дамы здаваліся ў арэнду ЖАКТам на ўмовах абавязковага правядзення рамонту. Прыбытковасць домаўладанняў, нягледзячы на залежнасць ад класавай прыналежнасці плацельшчыка, залежала ад месцапалажэння дома.

Памер новага будаўніцтва быў недастатковым: сярэдняя жылплошча на чалавека ў горадзе скарачалася. Большая частка жыллёвага будаўніцтва прыпадала на прыватных будаўнікоў, што разглядалася дзяржавай як часовая з'ява.

Наступствам вострага недахопу жылля сталі камунальныя кватэры – месцы сумеснага пражывання людзей, якія не былі аб'яднаны аніякімі сувязямі. Камунальныя кватэры не разглядаліся ўладамі як месцы фарміравання «новага быта».

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Бураков, В. Н.* Муниципализация жилищного фонда в БССР (1919–1929) / В. Н. Бураков // Вестник Полоц. гос. ун-та: науч.теорет. журнал. – 2013. – № 9. – С. 106–109.

2. *Бураков, В. Н.* Классовый принцип жилищной политики БССР в период НЭПа / В. Н. Бураков // Веснік Магілёўск. дзярж. пед. ун-та імя І. П. Шамякіна: нав.-метад. часопіс. – 2008. – № 3. – С. 11–16.

3. *Бураков, В. Н.* Ограничение права пользования жилой площадью в Белорусской ССР в 1920-е г.: историко-правовой аспект / В. Н. Бураков // Веснік Магілёўск. дзярж. пед. ун-та імя А. А. Куляшова: нав.-метад. часопіс. – 2010. – № 1. – С. 32–39.

4. *Меерович, М. Г.* Наказание жилищем: жилищная политика в СССР как средство управления людьми (1917–1937 годы) / М. Г. Меерович. – М: Российская политическая энциклопедия (РОССПЭН); Фонд Первого Президента России Б. Н. Ельцина, 2008. – 303 с.

5. *Гужалоўскі, А. А.* Сэксуальная рэвалюцыя ў Савецкай Беларусі: 1917–1929 гг. / А. А. Гужалоўскі. – Мінск: А. М. Янушкевіч, 2017. – 258 с.

6. Резолюции и постановления XVII съезда РКП(б), 18–23 марта 1919 г. / КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. 1917–1922 / Издательство политической литературы. – 9-е изд. – М.: Политиздат, 1983. – Т. 2. – С. 71–115.

7. *Воинов, А. А.* Жилищное строительство в Белорусской ССР / А. А. Воинов. – Минск: Выш. шк., 1980. – 220 с.

8. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Ф. 3. Воп. 1. Спр. 158.

9. Жилищный кризис и борьба с ним // Звязда. – 1925. – 21 кастр. – С. 4.

10. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці. – Ф. 355. Воп. 1. Спр. 2.

11. Об оплате жилых помещений в городских поселениях БССР: постановление СНК БССР, 1 июля 1925 г. // Бюлетэнь Савета Народных Камісараў Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі. – Менск [Мінск]: Інфармацыйна-выдавецкае бюро кіраўніцтва спраў СНК і Эканамічнага савета. – 1925. – № 6. – С. 13–15.

12. Жилищные условия жизни рабочих и служащих в городах и фабрично-заводских поселках БССР в 1925 г. // Бюллетень Центрального статистического управления. – Минск: ЦСУ БССР, 1925. – № 3. – С. 61–76.

13. *Рак, Г. П.* Прыбытак домаўладаньнняў места Менску ў 1914 г. і ў сучасны момант / Г. П. Рак // Советское строительство: ежемесяч. общ.-экон. журн. – Минск: Ред.-изд. отд. Госплана БССР. – 1925. – № 3. – С. 198–202.

14. Минский городской Совет депутатов, 1917–2012: документы и материалы / Департамент по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Республики Беларусь [и др.]. – Минск: Белорусский Дом печати, 2012. – 727 с.

15. На борьбу с разрушением жилой площади// Звязда. – 1925. – 16 дек. – С. 3.

16. О Московском городском хозяйстве и о развитии городского хозяйства СССР: резолюция Пленума ЦК ВКП(б) от 15 июня 1931 г., № 165 // КПСС в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК. – 1984. – Т. 5. – С. 313–326.

**(Дата падачы: 23.02.2022 г.)**

*А. А. Приборович*
Белорусский государственный университет, Минск

*A. Priborovich*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 930.2**

# ИСТОРИЧЕСКИЙ ИСТОЧНИК В ВЕК ЦИФРОВОГО КОНТЕНТА

# HISTORICAL SOURCE IN THE AGE OF DIGITAL CONTENT

*Автор статьи анализирует проблему обновления корпуса источников исследований по истории, вызванной цифровизацией общества в последние десятилетия. Результаты статьи показывают, что методология исторической науки требует значительного развития в вопросах разработки классификации и методики работы с цифровыми историческими источниками, а также формирования основ компьютерного источниковедения.*

*Ключевые слова: цифровизация; трансформация общества; исторический источник; цифровой контент.*